**Я.Р. САМУЙЛІК**
Беларусь, Брэст

# ЛІНГВАГЕАГРАФІЯ ГАВОРАК ВЫГАНАЎСКАГА ПАЛЕССЯ

Выганаўскае Палессе – рэгіён у міжрэччы Ясельды (прыток Прыпяці) і Шчары (прыток Нёмана). У яго межах знаходзіцца Выганаўскае, або Выганашчанскае возера (плошча 26 км$^2$). Адміністрацыйна – гэта паўднёвая частка Івацэвіцкага раёна (Целяханшчына) і прылягаючая тэрыторыя Ляхавіцкага, Ганцавіцкага, Лунінецкага і Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці. Выганаўскае Палессе знаходзіцца пераважна ў Заходнім Палессі, у паўночнай яго частцы, на мяжы з Панямоннем. Геаграфічна і гістарычна дадзены рэгіён размешчаны паміж “тыповым” Заходнім Палессем і Панямоннем, а ў этнаграфічным аспекце з’яўляецца месцам сутыкнення чатырох буйных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: Паўночна-Заходняга, або Панямоння, Цэнтральнай Беларусі, Усходняга Палесся і Заходняга Палесся. У лінгвістычным плане Выганаўскае Палессе ўваходзіць у пераходую зону паміж гаворкамі Панямоння і Заходняга Палесся. Тут праходзіць значная колькасць ізаглос [1; 2; 3; 4, с. 180–196]·

Найбольш пашыраны ў Выганаўскім Палессі паўночнабрэсцкія гаворкі, пераважна іх цэнтральнацеляханская падгрупа. На поўдзень ад названых гаворак бытуюць гаворкі паўднёвацеляханскія. На крайнім поўдні рэгіёна – гаворкі валішчанска-аброўскія, паўночна- і сярэдне-загародскія [5; 6, с. 201–214].

Для больш дакладнага ўстанаўлення структуры мясцовых гаворак і характару моўных працэсаў было вырашана даследаваць названы рэгіён лінгвагеаграфічным метадам, г.зн. скласці дыялектны мікраатлас Выганаўскага Палесся.

Наш атлас адносіцца да рэгіянальных дыялектных атласаў. Ён уключае паўднёвую частку Івацэвіцкага раёна і памежныя тэрыторыі Ганцавіцкага і Пінскага раёнаў. Усяго складзена 154 карты, з іх 12 уступныя (№ I – XII) і 142 лінгвістычныя. На ўступных картах пададзена сучаснае адміністрацыйнае дзяленне гэтай тэрыторыі (№ I), пашырэнне лясных і балотных масіваў у сярэдзіне XX ст. (№ II), карта этнаграфічных рэгіёнаў (№ III; па В.С. Цітову), карта сучаснага дыялектнага чляненне гаворак Выганаўскага Палесся (№ IV), гістарычныя карты (№ V – XII). Лінгвістычныя карты прысвечаны фанетыцы (56 карт, з іх 24 – вакалізму і 22 – кансанантызму), марфалогіі (33 карты), лексіцы (52 карты) і семантыцы (1 карта). Уступныя і лінгвістычныя карты з дадатковымі

матэрыяламі падрыхтаваны да друку ў выглядзе “Атласа народных гаворак Выганаўскага Палесся” (219 с.).

Лінгвагеаграфічнае даследаванне мовы рэгіёна дало магчымасць адасобіць асноўную частку Выганаўскага Палесся (Целяханшчыну) як пэўную, выразна акрэсленую дыялектную адзінку на аснове наступных адзнак[1] : [о > э$^{ы}$, ê : о > о, ô, уо, ы і інш.] вэ$^{ы}$з, в'êз, стэ$^{ы}$л : воз, стол. вôз, стôл, вуоз, стуол, выз, стыл[2] і інш. (карта № 2); [о > ы, і : о > о, ô, а, у] пыд, п'ід: под, пôд, пад, пуд (карта № 3); [губна-губны зычны 'w' : губна-паўгалосны 'ў', зубны 'v'] хл'еw, пра́wда, до́wг'і до́wг˙и, куп'іw, куп'іw : хл'еў, пра́ўда, до́ўгі, купіў, хл'іv, хлы$^{е}$v, пра́vда, до́vг˙и, до́vгы, куп˙и́v, купы́v і інш. (карты №№ 12, 41); [галосны на месцы 'ę' – е : а] гл'едз'е́в, гл'ед'е́в, гл'едз'е́ў, гл'едз$^{д}$'е́в, гл'ед'ів : гл'адз'е́ў і інш. (карта № 13); йейцэ́м : йайцо́м, йайцэ́м, йійцэ́м і інш. (карта № 15а); жало́, жэло́ : жа́ло, жарло́, жэрло́, ж˙ирло́, жорло́, жырло́ і інш. (карта № 19); часно́к : часны́к, часн˙ик, часн'ік, чосны́к, чэсно́к і інш. (карта № 21); [палаталізаваныя зычныя дз', ц' перад рэфлексамі е, і, һ : палатальныя зычныя дз'', ц'', мяккія зычныя дз$^{д}$', ц$^{т}$', гістарычна мяккія зычныя д', т', цвёрдыя (часам “паўмяккія”) зычныя д, т перад рэфлексамі е, і, һ] дз'ен', ц'епэ́р, ц'еп'е́р, ц'епэ́ра, ходз'іц'і, ходз'іц', ц'іхо, дз'ед, ц'ен' : дз''ен', ц''еп'е́р, ц''епэ́р, хадз''іц'', ходз''іц'', ц''іхо, дз''ед, ц''ен'; дз$^{д}$'ен', ц$^{т}$'епэ́р, ходз$^{д}$'іц$^{т}$'і, ц$^{т}$'іхо, дз$^{д}$'ед, ц$^{т}$'ен'; д'ен', т'епэ́р, ход'іт'і, т'іхо, д'ед, т'ен', д'ід, т'ін'; дэн', дэн'о́к, тэпэ́р, т˙эпэ́р, тыпэ́р, ты$^{е}$пэ́р, ход˙и́т˙и, т˙и́хо, ходы́ты, ты́хо, ды$^{е}$д, ты$^{е}$н', тэн'о́к і інш. (карты №№ 32, 33, 34); [этымалагічна мяккія д', т' перад рэфлексамі і : адпаведна палатальныя дз'', ц'', палаталізаваныя дз', ц', мяккія дз$^{д}$, ц$^{т}$', “паўмяккія” і цвёрдыя зычныя д, т] ход'іт'і, т'іхо : хадз''іц'', ходз''іц'', ц''іхо; ходз'іц'і, ходз'іц', ц'іхо; ходз$^{д}$'іц$^{т}$'і, ц$^{т}$'іхо; ход˙и́т˙и, т˙и́хо, ходы́ты, ты́хо і інш. (карта № 33); [цвёрды зычны т на канцы дзеяслоўных форм трэцяй асобы адзіночнага і множнага ліку : палатальны ц'', палаталізаваны ц', этымалагічна мяккі зычны т' у акрэсленай пазіцыі] хо́дз'іт, хо́дз'ат, хо́д'іт, хо́д˙ит, хо́д'ат, хо́дз$^{д}$'іт, хо́дз$^{д}$'ат : хо́дз''іц'', хо́дз''ац''; хо́дз'іц', хо́дз'ац'; хо́д'іт', хо́д˙ит', хо́дыт', хо́д'ат' і інш. (карта № 35); на мэжэ́ на м'ежэ́, на ма́жэ́: на м'ажы́, на мэж˙и́, на мэжы́, на мыж'і́ і інш. (карта № 56); бабэ́й, баб'е́й, хатэ́й : баб, ба́баў, бабо́ў, хат, ха́таў, хато́ў і інш. (карта № 59); у чо́ботах, чобо́тах, чобота́х : у чобо́ц'ах, чобо́т'ах, чо́боц'ах, чобоц'а́х, чобо́т'ех, чо́бот'ух /у бо́тах/ і інш. (карта № 62); пэкц'е́, пэкт'е́, п'екц'е́, пэкц$^{т}$'е́, пэкц'і, п'е́кц'і, пэкт˙и́, пэкты́, с'е́кц'і, с'е́кт'і, с'е́кц$^{т}$'і, с'е̂кт˙и,

---

[1]Двукроп'е [:] паміж прыкладамі абазначае іх арэальнае супрацьстаўленне.

[2] Перад двукроп'ем прыводзяцца рысы, характэрныя асноўнай частцы гаворак Выганаўскага Палесся (Целяханшчыне), пасля двукроп'я – рысы, уласцівыя іншым гаворкам.

*сэкт'і, сэкт'и, сэкты́, сэкт'е́ : п'ачы́, п'ечы́, с'ачы́, с'ечы́, пычы́, сычы́* і інш. (карта № 75); *ходз'у́, ходз$^{д}$'у́, ход'у́, нос'у́ : хаджу́, ходжу́, хажу́, хожу́, нашу́, ношу́* (карта № 78); [дзеяслоў *'вісець'* у форме трэцяй асобы множнага ліку ў выразе *'часы вісяць'] в'е́с'ат, в'е́с'ат', в'е́с'ац', в'ес'а́т : в'іс'ац', в'іс'ат, в'іс'ат', в'іс'ет'; в'іс'а́ц', в'іс'а́т, в'іс'а́т'* (карта № 84); *со́н'ен'ко, со́нэн'ко, со́нэнко : со́н'ейко, со́нэйко, со́нэко, со́нко, со́нычко* і інш. (карта 86) *пэрэ́хмарок, пе'рэ́хмарок, пэр'э́хмарок /хма́рка/ : о́блако, во́блако; о́болок, оболо́к, о́блок* і інш. (карта № 87); [падасінавік] *красноголо́вэц, красноголо́в'ец : красноголо́в'ік, краснагало́в'ік, красн'у́к, красн'ік* і інш. (карта № 92) [3, к. 282]; [неядомыя грыбы] *овэ́чыйе, овэ́чы, ов'е́чы, овэ́ч'и /пол'аныйе, пол'евыйе/ : во́вчыйе, во́ўчыйе, во́вчы, во́ўчы, во́вч'ийе, во́вч'и /ж'а́бс'кы/* і інш. (карта № 93); *журахв'іны, журахв'ин'и, журахвы́ны : жураўл'іны, журав'іны, журахл'іны, журахлы́ны* і інш. (карта № 95); *чобу́р, чабу́р, ча$^{э}$бу́р, чы$^{э}$бу́р, чэбу́р, чыбу́р : чабо́р, ча$^{э}$бо́р, чобо́р, чэбо́р, чо́бор, чобэ́р, чобы́р, чабарэ́ц, чобор'э́ц, чы$^{е}$бърэ́ц, чыбырэ́ц, чэборэ́ц, шчыбырэ́ц', чабрэ́ц, чэбрэ́ц* і інш. (карта № 97); *пта́шка : пту́шка* (карта № 98); *орабу́шок, арабу́шок, гарабу́шок : рабу́шок, воробу́шок, гарабэ́шык, в'ераб'е́й, араб'е́й, вараб'е́й, вороб'е́й, воробэ́й, ворабэ́шок, гарабо́к, гарабэ́й, гарабэ́шок, орабэ́й, шво́раб* (карта № 102); *св'ін'н'е, свы́н'н'е : св'ін'н'і, св'ин'н'і, св'инн'и, свы́ны* і інш. (карта № 106); [свінні] *ру́хкайут, ру́хкайуц', ру́хкайут' : ро́хкайут, ро́хкайуц', ро́хкайут', ро́хайут'* (карта № 107); *йе́жык, йе́ж'ик : во́жык, йо́жык, о́жык, йеж, йож, йіж* (карта № 109); *пыдло́га, п'ідло́га, помэ́ст, пом'е́ст : подло́га, по̂дло́га, падло́га пудло́га, помо́ст, пому́ост* і інш. (карта № 111); *ла́пно /м'ел/ : ва́пна, ва́пно /поб'е́л, глэ́нка/* і інш. (карта № 112); [вага ў калодзежным жураўлі] *звод, звэд, звыд /дзвэн/ : ко́ворот, ко́варат, журавэ́л', бы$^{э}$гу́н, кага́н, смык* (карта № 117) [1, к. 243]; [значэнне слова "звод /звод, звэд, звыд, звід/"] *звод, звэд, звыд* – вага ў калодзежным жураўлі : *зв'ід, звыд* – саха ў калодзежным жураўлі (карта № 119); *нас'ілы, нас'ил'и, насы́лы : нос'ілы, нас'ілк'і, нос'ілк'і, нос'ілкы, нос'илк'и, насы́лыц'і, насы́лыцы* і інш. (карта № 121); *комн'ак'і : ком'йак'і, кам'ак'і, кум'йак'і; картопл'а́найа ка́ша, картопл'а́на ка́ша, ка́ша; товкан'іца, товкан'ица, товканы́ца, товканы́ц'а, тоўкан'іца, то́вча, товчэ́ныкы, товчэ́н'а, то́ўчанка* (карта № 125); *вуздэ́чка, уздэ́чка, вуздз'е́чка, уздз'е́чка, узд'е́чка, уздз$^{д}$'е́чка, возда́чка, во̂здэ́чка, вузда́ /л'е́йцы/ : обры́ц', обро́ц', абро́ц', во́бруц', обры́т'* і інш. (карта № 127); *спова́ц'і, спова́т'і, спова́ц', спова́т'и, спова́ты, спова́ц$^{т}$'і : сп'ава́ц', сп'ева́ц', сп'е$^{а}$вац', сп'ива́тэ, спыва́ты, спы$^{е}$ва́т'и, спы$^{э}$ва́т'и, спэва́ты* (карта № 130); [палатняная коўдра] *цэ́ха /ц'е́л'н'ік, ко́вдра/ : радно́, радз'у́жка, радз'у́шка, рад'у́шка, радз$^{д}$'у́жка, рад'у́жка, радз'у́га, дз'еру́га, дз'еру́шка* (карта № 132); *му́с'іт,*

<u>*му́с'іц'*</u>, <u>*му́с'и(т)*</u>, <u>*му́с'ит'*</u>, <u>*му́сыт'*</u> : <u>*ма́быц'*</u>, <u>*ма́буц'*</u>, <u>*мо́жа*</u>, <u>*мо́жэ*</u> (карта № 137).

Такім чынам, значная частка фанетычных, марфалагічных і лексічных з'яў, характэрных Выганаўскаму Палессю, мала пашырана ці амаль невядома ў суседніх рэгіёнах, і таму можна гаварыць аб выдзяленні цэнтральна-целяханскай падгрупы у структуры паўночнабрэсцкіх гаворак.

## ЛІТАРАТУРА

1 Дыялекталагічны атлас беларускай мовы. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1963.

2 Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969.

3 Лексічны атлас беларускіх народных гаворак : у 5 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993 – 1998.

4 Паўднёва-заходнія ізаглосы // Лексічныя ландшафты Беларусі : жывёльны свет. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – С. 180–196.

5 Клімчук, Ф. Д. Гаворкі Заходняга Палесся. Фанетычны нарыс / Ф. Д. Клімчук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983.

6 Крывіцкі, А. А. Дыялекталогія беларускай мовы / А. А. Крывіцкі. – Мінск : Вышэйшая школа, 2003. – С. 201–214.